Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні перад акцыямі пратэсту ў рэгіёнах: асноўны ўдар - па журналістах фота дапоўнена

18.03.2017 **Тэгі**: акцыі, затрыманні



Супрацоўнікі міліцыі спрабуюць забараніць працаваць журналістцы Вользе Чайчыц.

У сацыяльных сетках паведамляецца, што ў выходныя, 18 і 19 сакавіка, акцыі пратэсту супраць Дэкрэту №3 плануецца правесці сама мала ў 13 гарадах Беларусі. Сёння ранкам заўважаная актывізацыя сілавых структур у некаторых раённых цэнтрах, праводзяцца затрыманні. Ці адбудуцца акцыі – пакуль невядома. Пратэстоўцы выйшлі на плошчы ў Салігорску, Мазыры, Кобрыне, Светлагорску.

БелСАТ паведамляе пра месцы, дзе сёння магчыма адбудуцца акцыі пратэсту супраць падатку на дармаедства:

У Наваполацку – на плошчы Будаўнікоў.
У Светлагорску, Лунінцы, Салігорску, Горках, Барысаве – на цэнтральных плошчах.
У Асіповічах, Лідзе і Мазыры – на плошчах Леніна.
У Кобрыне – на плошчы Свабоды.
У Рэчыцы – на плошчы Кастрычніка.
У Жодзіне – на плошчы каля Палаца Культуры БелАЗа.

Кобрын. Толькі што забралі ў Кобрыне журналістаў **Алеся Ляўчука і Мілану Харытонаву**, якія прыехалі на асвятленне акцыі пратэсту ў Кобрыне. Іх тэлефоны заблакаваныя. Літаральна праз хвіліну, калі яны селі ў машыну, каб ехаць ў Брэст, іх спынілі супрацоўнікі ДАІ. Потым да іх далучыліся людзі ў цывільным.

Паведамляе праваабаронца **Уладзімір Вялічкін:** *"У Кобрыне а 13-10 былі затрыманыя журналісты БелСата Алесь Ляўчук і Мілана Харытонава. Яны здымалі сход жыхароў Кобрына на галоўнай плошчы горада. Грамадскія актывісты Алесь Мех і Васіль Андрэюк таксама знаходзіліся на плошчы. Да іх узніклі пытанні з боку супрацоўнікаў міліцыі. Журналісты суправадзілі грамадскіх актывістаў да машыны, каб яны маглі бяспечна пакінуць плошчу. Праз 5 хвілін Алесю Меху патэлефанавала жанчына, якая паведаміла, што журналісты БелСата затрыманыя і іх павезлі ў Кобрынскі РАЎС. У мітынгу прымаюць удзел каля 30-ці чалавек. На плошчы - шмат міліцыі"*

У Кобрыне цэнтральная плошча была цалкам аточаная міліцыянтамі. Усяго бралі ўдзел у мітынгу чалавек 25, побач яшчэ столькі ж грамадзян, якія баяліся наблізіцца, бо шмат было і ў цывільным, і з дручкамі , і даішнікаў таксама" - удакладняе Аляксандар Мех. Фактычна міліцыя не давала правесці акцыю. Больш трох гадзінаў правялі ў міліцыі ў Кобрыне незалежныя журналісты Мілана Харытонава, Алесь Ляўчук і кіроўца аўтамабіля.



Іх сілай выцягнулі з машыны, білі, выкручвалі рукі, пашкодзілі відэакамеру і тэлефоны. Завезлі ў РАЎС. Развялі Алеся і Мілану ў асобныя кабінеты, склалі 2 пратаколы, за парушэнне заканадаўства аб СМІ – арт. 22.9 КаАП і за непадпарадкаванне законнаму патрабаванню супрацоўніка міліцыі. Доўга раіліся з некім па тэлефоне і па-за кабінетам, што з імі рабіць.

На журналістаў склалі пратаколы за непадпарадкаванне супрацоўнікам міліцыі, а таксама, за незаконны выраб і распаўсюджванне прадукцыі СМІ. Камеру пакуль сканфіскавалі. Адпусцілі ў 16-40.





Барысаў. Раніцай супрацоўнікі міліцыі затрымалі тут актывіста **Алеся Абрамовіча** і сябра АГП **Івана Помаза**. Падышлі людзі ў цывільным, сказалі праехаць з імі ў РУУС, прычынай назвалі тое, што яны нібыта планавалі сёння правесці акцыю пратэсту ў Барысаве. Тэлеканал belsat вядзе наўпроставую трансляцыю з Барысава. Акрамя пераапранутых супрацоўнікаў міліцыі і падлеткаў на цэнтральнай плошчы нікога няма.

Стала вядома, што Івана Помаза адпусцілі. У аддзяленні міліцыі застаўся Абрамовіч. Намеснік начальніка міліцыі **Беразінскі** паведаміў барысаўскаму праваабаронцу, што Абрамовіч не затрыманы, ён прыехаў добраахвотна, з ім вядуцца дзеяньні працэсуальнага кшталту, як са сведкам па адміністрацыйнай справе. Яе сутнасць паведаміць адмовіўся.

Двое супрацоўнікаў міліцыі з Аддзела аховы правапарадку Барысаўскага РАУС спрабуюць затрымаць здымачную групу БелСАТу, павялі іх для далейшага разбіральніцтва ў РАУС. Сярод іх - журналістка **Вольга Чайчыц і Сяржук Кавалёў.** За іх заступаюцца людзі. Журналістаў адвезлі ў мясцовы РАУС. Туды накіраваўся журналіст Аляксандр Зянькоў. Журналістаў БелСАТу адпусцілі з міліцыі ў 15 гадзін.



У 13-30 Алеся Абрамовіча выпусцілі з РАУСа. Праваабаронца **Алег Мацкевіч** паведамляе, што Абрамовічу вынеслі афіцыйнае папярэджанне, падпалкоўнік Шаховіч, намеснік начальніка, сказаў, што ў выпадку далейшага парушэння за ім будзе ўсталяваны прафілактычны нагляд. Абрамовіч з'ехаў маршруткай у Мінск.

Салігорск. На цэнтральнай плошчы сабралася 12 чалавек. Праз гадзіну акцыя скончылася. Затрыманняў удзельнікаў акцыі не зафіксавана.



У Лунінцы арыштавалі позна ўначы сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) **Аляксандра Неўдаха**. Яго забралі з яго дзяўчынай, сказалі, што аграбіў дзяўчыну і забраў у яе сумачку. Першы раз Неўдаха забралі ў 24 гадзіны, 3 гадзіны пратрымалі і адпусцілі. Як толькі выйшлі яны з міліцыі, яго зноў забралі, - паведамляюць мясцовыя актывісты. Акцыя ў Лунінцы не адбылася.

Мазыр. 17 сакавіка ў Мазырскі РАУС тэрміновава выклікалі актывіста **Рыгора Крывіцкага.** У яго ўзялі тлумачэнні, што ён гарантуе 26-га парадак, і законнасць заяўленай акцыі. Таксама запытваліся пра акцыю ў Мазыры 18-га сакавіка. Ён адказаў, што не мае да гэтага ніякага дачынення, але прыедзе паглядзець, што там будзе адбывацца.

На цэнтральнай плошчы Леніна ў Мазыры сабралася каля 20-ці чалавек. Кіраўніцтва міліцыі некалькі разоў папярэджвала мітынгоўцаў, што акцыя незаконная.

У Мазыры пасьля мітынгу затрыманыя 4 ўдзельнікі. Зараз ягы находзяцца ў РАУС ужо 3 гадзіны. Адзін змог патэлефанаваць. Гэта - **Шаўко Алег.** Яго затрымалі ў бальніцы пры наведванні хворага бацькі пасля акцыі.

У міліцыі таксама знаходзяцца **Аляксандр Барысенка, Аляксандар Трошка** і жанчына, якую завуць **Нона.**





Сёння ў 10 гадзін раніцы супрацоўнікі ДАІ некалькі разоў спынялі аўтамабіль гомельскай журналісткі **Ларысы Шчыраковай**, якая накіроўвалася ў Мазыр. Кіроўцу паведамілі, што машына нібыта знаходзіцца ў угоне і трэба ехаць на праверку ў Рэчыцу.

> *"Мяне затрымала ДАІ па дарозе на Мазыр...1.5 гадзіны таму...сяджу зараз пад іх канторай у Рэчыцы...чакаю эксперта, які нібыта будзе глядзець машыну, ці не крадзеная"*,- паведаміла праваабаронцам Шчыракова.

Тым часам Ларыса Шчыракова знаходзіцца пад пільнай аховай міліцыі 3 гадзіны, чакаюць следчых, якія выехалі з Гомеля. Ларыса Шчыракова разам з праваабаронцам Валерыем Пуціцкім хацелі падаць скаргу на затрыманне ў мясцовую пракуратуру, аднак там сёння нікога няма. Прыехаў аўтамабіль службы “Ахова”, нібыта спрацавала сігналізацыя.

Разам з журналісткай затрыманы і **Кастусь Жукоўскі**, які кіраваў уласным аўтамабілем. Супрацоўнікі ДАІ патрабуюць паказаць, што знаходзіцца ў багажніку. Спадар Жукоўскі патрабуе, каб гэта зрабілі з панятымі.

Тывм часам маёр Кашчээў праводзіць разбіральніцтва па факце крадзяжу грошай у жыхаркі вёскі Раманавічы. Падазраваная Ларыса Шчыракова.



Наваполацк. Па дарозе з Віцебска ў Наваполацак у Шумілінскім раёне супрацоўнікі ДАІ затрымалі аўтамабіль з незалежнымі журналістамі **Сяргеем Русецкім** і **Ўладзімерам Лунёвым.** Пра гэта перадае Радыё Свабода. Спачатку іх абвінавацілі ў парушэнні правілаў дарожнага руху і адпусцілі. Пазней іх зноў затрымалі ўжо ў Полацкім раёне і вязуць у Полацкі РУУС. Міліцыянты кажуць, што будуць правяраць, ці не перабітыя нумары на кузаве аўтамабіля. Затым, што яны падазраюцца ў агрэбленні банка у вёскі Фарынава. Пасля 14 гадзін Русецкага і Лунёва адпусцілі. Сярод затрыманых была і журналістка **Алена Сцяпанава.** Усе яны зараз вяртаюцца ў Віцебск.

Светлагорск. Мясцовага блогера **Генадзя Жулегу** некалькі дзён актыўна расшуквала міліцыя, каб уручыць адказ Светлагорскага выканкама на ягоную заяўку аб правядзенні мітынгу ў горадзе 18 сакавіка.

“Пададзеная заяўка на правядзенне масавага мерапрыемства не адпавядае патрабаванням артыкула 5 Закона аб масавых мерапрыемствах РБ" - адказвае райвыканкам.

На цэнтральную плошчу каля будынка райвыканкама выйшлі каля 25 чалавек. Раней у сацыяльных сетках распаўсюджвалася інфармацыя аб правядзенні 18 сакавіка ў райцэнтры «мітынг вольных беларусаў». У выніку, як паведаміла БелаПАН праваабаронца **Алена Маслюкова**, на плошчы сабраліся

каля 25 чалавек, і міліцыя - у цывільным, і ў форме.

Па інфармацыі Генадзя Жулегі ў Светлагорску быў затрыманы **Аляксей Блажэвіч**, які таксама падаваў заяўку на правядзенне мітынга. Сведкі паведамляюць, што яго затрымалі да суда. Ён таксама пакараны 10-суткавым арыштам.



ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**СВЕТЛАГОРСКІ РАЁННЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

Цэнтральная плошча, 1, 247434, г. Светлагорск
Гомельская вобласць, Рэспубліка Беларусь
тэл. (02342) 7 12 10, факс 2 20 31

10.03.2017 № 08 01-05/49

На № _____ ад _____

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**СВЕТЛОГОРСКИЙ РАЙОННЫЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

Центральная площадь, 1, 247434, г. Светлогорск
Гомельская область, Республика Беларусь
тел. (02342) 7 12 10, факс 2 20 31

Жулего Г.Г.

[redacted]

На Ваше обращение в Светлогорский районный исполнительный комитет по поводу проведения митинга/демонстрации/пикета сообщаем следующее.

Порядок организации и проведения собраний, митингов, уличных шествий, демонстраций, пикетирования и иных массовых мероприятий установлен Законом Республики Беларусь от 30 декабря 1997 г. № 114-З «О массовых мероприятиях в Республике Беларусь» (далее – Закон) и решением Светлогорского районного исполнительного комитета от 16 января 2015 года № 50 «О массовых мероприятиях в Светлогорском районе» (зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов Республики Беларусь 2 февраля 2015 г. регистрационный № 9/68693) (далее – решение).

Поданное Вами заявление о проведении массового мероприятия не соответствует требованиям статьи 5 Закона и решения.

В связи с этим, Светлогорский районный исполнительный комитет запрещает проведение Вами массового мероприятия 18 марта 2017 г. на Центральной площади г. Светлогорска.

Заместитель председателя К.В.Петровский



Слонім. 19 сакавіка на плошчы Леніна ў 13 гадзін плануецца Народны сход супраць “дэкрэту дармаедаў”. Чыноўнікі Слонімскага райвыканкаму прапануюць не праводзіць сход, а правесці сустрэчу з вертыкальшчыкамі ў актавай зале райвыканкаму ці ў актавай зале Слонімскага цэнтра культуры. А вось кіраўнікі некаторых дзяржаўных устаноў і прадпрыемстваў правялі сходы калектываў, на якіх папярэдзілі сваіх работнікаў, хто прыме ўдзел у Народным сходзе, будзе звольнены з працы. Слонімскія актывісты **Віктар Марчык і Алесь Масюк** раней сустракаліся на гэты конт з намесніцай старшыні Слонімскага райвыканкаму Кацярынай Руткоўскай.

У аграгарадку **Квасевічы**, Івацэвіцкага раёна на фабрыку «Пух-пяро» 16 сакавіка прыехалі супрацоўнікі УУС Брэсцкага аблвыканкама, правялі сход з работнікамі, прыгражалі крымінальнай адказнасцю за ўдзел у акцыях недармаедаў у Слоніме 18.03, Менску 25.03 і калі што будзе ў Івацэвічах (пакуль не плануецца), - піша “Наша Ніва”.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY